УДК 811.161.3

# Тэрміны-гіпонімы і тэрміны гіперонімы ў машынабудаўнічай тэрміналогіі

Гіруцкая Л.А., Сахончык А.П.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У галіне тэхнікі тэрмін суадносіцца з пэўным прадметам, таму асабліва выразна прасочваецца матэрыяльны бок мовы, а лінгвістычныя працэсы ў тэрміналогіі (тэрмінаўтварэнні) маюць як унутраную аснову, так і пазамоўную абумоўленасць. З абагульняльнай прыроды слова выцякае, што рода-відавыя адносіны ў лексіцы носяць глабальны характар, з'яўляюцца самымі распаўсюджанымі парадыгматычнымі сувязямі слоў, пранізваюць усю лексіку, у тым ліку і тэрміналагічную. Словы з родавым паняццем у мовазнаўстве называюцца гіперонімамі, словы з відавымі паняццямі – гіпонімамі. Гіпера-гіпанімічная парадыгма абапіраецца на тэматычную і характарызуецца наяўнасцю гіпероніма і гіпонімаў .

Сучасная машынабудаўнічая тэрміналогія характарызуецца актыўным стварэннем полікампанентных тэрмінаў-словазлучэнняў, утвораных сінтаксічным спосабам. Яны прадстаўлены рознымі структурнымі тыпамі з рознымі сінтаксічнымі тыпамі сувязі.

Асобныя тэрміны, становячыся ў працэсе ўтварэння шматкампанентных тэрмінаў ядром утварэння новых лексічных адзінак і цэлых словаўтваральных гнёздаў, групуюць вакол сябе новыя, больш складаныя ў структурных адносінах тэрмінаадзінкі. Апошнія выдзяляюць названыя прадметы (працэсы, дзеянні, станы, якасці, уласцівасці) з шэрагу падобных ім па якіх-небудзь дадатковых прыкметах. Такім чынам, з дапамогай уводзімых удакладненняў адбываецца звужэнне родавага паняцця (гіпероніма), якое выражаецца ўжо існуючым тэрмінам, да відавога (гіпоніма): утулка *–замацавальная, накіравальная, пераходная, падшыпніка слізгання, ушчыльнікавая, упорная*; абточка – *алмазная, падоўжная, папярочная, патылічная, фасонная, чарнавая, чыставая, эксцэнтрычная, пад наплаўку, па капіру, па ўпора;* дзяўбанне *– падоўжнае, падоўжнае дзяўбанне даўбяком, папярочнае, папярочнае дзяўбанне даўбяком, без размёткі, пад працяжку, па контуры, спосабам абкаткі.*

Гіпанімічныя адносіны могуць выражацца як у фармальных (фармальна-семантычныя гіпанімічныя сувязі), так і ў семантычных сувязях тэрмінаў (уласна семантычныя гіпанімічныя сувязі).

Прадукцыйнасць шматкампанентных тэрмінаў выклікаецца тэндэнцыяй моўнага развіцця. Яны ствараюцца з ужо наяўных лексем і могуць цалкам пакрываць паняційнае поле тэрміналогіі машынабудавання.